# Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі і яе сучасныя прадстаўнікі

УДК 78.071.2(476)(092)

**В. У. Дадзіёмава**

## ШЛЯХАМ СТВАРЭННЯ: АБ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МІХАІЛА КАЗІНЦА

***У гісторыі духоўнай культуры ўсіх эпох і народаў ёсць знакавыя постаці, якія шмат у чым вызначаюць змястоўнае аблічча свайго часу і шляхі разгортвання мастацкага працэсу. У айчынным гістарычным руху такіх асоб нямала: багатая на таленты беларуская зямля не толькі заўжды нараджала сапраўдных волатаў духу, але і шчодра даравала іх розным краінам. Так было ў мінулым, так ёсць і сёння, калі ад намаганняў канкрэтных людзей асабліва істотна, нават наўпрост залежыць лёс важнейшых сфер айчыннай культуры. У яе музычнай галіне такой Асобай з'яўляецца, безумоўна, Міхаіл Антонавіч Казінец, чыя плённая, шматгранная, самаадданая дзейнасць моцна паўплывала на развіццё беларускага музычнага мастацтва, на яго міжнародны імідж і аўтарытэт.***

Ураджэнец вёскі Цынцавічы, што на Вілейшчыне, ён з дзяцінства захапляўся музыкай і зрабіў усё, каб атрымаць грунтоўную музычную адукацыю. М. Казінец закончыў Белдзяржкансерваторыю па класу не толькі баяна (1965), але і оперна-сімфанічнага дырыжыравання (1973). Надзвычайныя здольнасці, апантанасць у прафесійнай дзейнасці дазволілі яму адразу ж стаць дырыжорам, а неўзабаве галоўным дырыжорам Дзяржаўнага народнага аркестра імя І. Жыновіча. Не скрочыўшы з музыканцканга шляху — як кіраўнік аркестра, М. Казінец у 1985 годзе ўзначаліў Белдзяржкансерваторыю і больш за 20 гадоў быў рэктарам сённяшняй Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Міхаіл Антонавіч таксама плённа працаваў у нашай установе як прафесар кафедры аркестравага дырыжыравання, быў абраны саветам БДАМ ганаровым рэктарам.



*Народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесар М. А. Казінец*

Калі зірнуць на жыццёвы шлях і творчую дзейнасць гэтага чалавека, дык першае ж уражанне, што ўзнікае адразу (а яно, як вядома, найбольш слушнае), — гэта здзіўленне ад парадаксальнасці спалучэнняў неспалучальных, падавалася б, пачаткаў. Ужо ўласна музычная яго дзейнасць пазначана надзвычайнай living рознабаковасцю. Слынны дырыжор, мастацкі кіраўнік добра вядомых у свеце, буйных выканальніцкіх калектываў — Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча і сімфанічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі «Маладая Беларусь», ён здолеў узначаліць вельмі розныя па свайму саставу (інструментальнаму і асабоваму), па рэпертуару і мастацкай накіраванасці музычныя супольнасці. Калі першы аркестр увасабляў неўтаймаваную стыхію і няспынную, спрадвечную энергію беларускага народнаінструментальнага свету, яго каранёвыя, глебавыя ўласцівасці — як выразніка ды захавальніка этнічнай адметнасці беларусаў, дык другі акрэсліваў акадэмічны кірунак музычнай творчасці і, канцэнтруючыся на сусветна-інтэгратыўных, класічных галінах музычнай творчасці, не толькі высокамастацка пераўтвараў, але і гарантаваў няспыннасць, вечнасць і перспектыву рэгенерацыі гэтай галіны, аддадзенай у рукі, у душы ды сэрцы маладых.

Насамрэч, аказваецца, ніякай супярэчнасці ў суіснаванні пад дырыжорскімі крыламі аднаго маэстра такіх розных па свайму гукаваму полю калектываў не было, бо ёсць вышэйшая арганіка спалучэння вуснай і пісьмовай традыцыі, народнага і акадэмічнага свету, і асабліва — беларускага, у якім менавіта на гэтым спалучэнні і трымаецца на-

Репозиторий Учреждение образования «Белорусская государственная академия музыки»



*М. А. Казінец — мастацкі кіраўнік і дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. І. Жыновіча*

цыянальная музычная ідэя. На тым жа падмурку, як вядома, заснавана, кажучы больш глабальна, складаная, драматычная гісторыя беларускага народа (у шырокім разуменні гэтай катэгорыі, што яднае розныя яго сацыяльныя слаі і генерацыі), здольнага ва ўсе стагоддзі заставацца высокадухоўным, шчодра адораным, самадастатковым і разам з тым адкрытым мастацкаму сусвету. Такім з'яўляецца і сам Міхаіл Антонавіч, і яго цудоўныя аркестры. Нездарма столькі прыхільнікаў, аматараў і нават фанатаў маюць гэтыя калектывы ў Беларусі і за мяжой, столькі ўсхваляваных водгукаў атрымлівалі іх выступленні ў Італіі, Францыі, Германіі, Чэхіі і іншых краінах. Але самы цёплы прыём маюць аркестры, зразумела, на радзіме, тым больш што выступаюць яны у розных яе цэнтрах — ад Мінска, Гомеля, Віцебска і Брэста да Маладзечна і Вілейкі.

Агульнай субстанцыяй, што яднае абодва калектывы, заўсёды была не толькі іх адпаведнасць якасцям ды сэнсам беларускай культуры, але і вышэйшым праявам гэтых якасцей, увасобленых у бездакорнасці прафесіяналізму, тонкім гусце, спасціжэнні сапраўднага майстэрства і глыбокім пранікненні ў сутнасць музычнага мастацтва ва ўсіх яго жанрава-стылявых адгалінаваннях — ад еўрапейскай класікі, твораў рускіх майстроў да ўсяго багацця беларускай творчасці. Асабліва яскрава нацыянальныя рысы выяўляюцца ў рэпертуары народнага аркестра, што стаўся сапраўднай візітоўкай беларускага выканальніцкага мастацтва. Лепшыя беларускія кампазітары прысвячаюць яму свае творы, адзін пералік якіх склаў бы, напэўна, некалькі старонак. Прыгадаем толькі імёны некаторых аўтараў, што здаўна лічылі і сёння лічаць за гонар супрацоўнічаць з аркестрам: гэта А. Багатыроў і М. Аладаў, П. Падкавыраў і Ю. Семяняка, Г. Вагнер і В. Іваноў, В. Войцік і К. Цесакоў, Дз. Смольскі і А. Мдзівані, В. Помазаў і А. Друкт, Р. Сурус і Я. Дзягцярык, А. Рашчынскі і многія іншыя выдатныя майстры.

Схіляючы галаву перад знаным Маэстра, варта ізноў выказаць непераадольнае пачуццё захаплення і здзіўлення. Ад таго, што яго дырыжорская, мастацка-стваральная дзейнасць як кіраўніка выдатных творчых калектываў увогуле магла сумяшчацца яшчэ з чымсьці. А між тым для многіх пакаленняў беларускіх музыкантаў Міхаіл Казінец — гэта перадусім рэктар Белдзяржкансерваторыі і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі на працягу дваццаці з паловай гадоў. То быў вельмі няпросты этап у гісторыі нашай краіны, якая крочыла да сваёй незалежнасці, а потым гожа ўмацоўвала яе ўсёй грамадой. Падараваць дзяржаве музычную, мастацкую сучаснасць і будучыню — такую звышзадачу вырашаў рэктар штодня, здзяйсняючы місію свайго служэння беларускаму мастацтву. Вынікі той працы немагчыма пераацаніць, бо выпускнікі тых гадоў сёння складаюць цэлую генерацыю адданых творчасці спецыялістаў, якія працуюць ва ўсіх музычных установах краіны. Сярод іх — сотні лаўрэатаў міжнародных конкурсаў, стыпендыяты спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, заслужаныя артысты Беларусі, кандыдаты і дактары навук, кіраўнікі творчых калектываў і арганізацый. За гады працы М. Казінца на пасадзе рэктара былі адкрыты новыя памяшканні БДАМ, створаны важнейшыя творчыя і навуковыя структуры — ад міжнароднага і канцэртнага аддзелаў да Праблемнай навукова-даследчай лабараторыі музыкі, савета па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, многіх іншых, сёння ўжо неад'емных ад дзейнасці акадэміі ўтварэнняў.

Для мяне ж, як супрацоўніка, а сёння — загадчыка кафедры беларускай музыкі з усіх пазначаных і не пазначаных (бо ўсё ўзгадаць проста немагчыма) кірункаў дзейнасці рэктара галоўным з'яўляецца стварэнне нашай кафедры. Гэтая падзея адбылася ў 1991 годзе, калі вызначаўся шлях самастойнай краіны, яе нацыянальнай культуры, увасобленай у тым ліку і ў адметнасці музычнага ды музыкалагічнага аблічча. Ідэя фарміравання, умацавання апошняга і падштурхнула рэктара да стварэння спецыяльнай структуры, якая магла б генерыраваць беларускую музычную думку ў галоўных яе сферах — этнамузыкалогіі і гісторыі музыкі. А яшчэ — аб'яднаць пад адным дахам інавацыйныя на той час па змесце беларусазнаўчыя адгалінаванні — музычную літургіку, журналістыку, рэдактарскую, лектарскую працу і інш. Варта ўзгадаць, што і да стварэння кафедры беларуская музыкалогія была ў пашане. Дзякуючы распрацоўкам Г. Глушчанкі і К. Сцепанцэвіч, С. Нісневіч і Г. Куляшовай, дзякуючы нястомнай падвіжніцкай працы Л. Мухарынскай, многіх іншых легендарных вучоных і выкладчыкаў гэтая сфера ўжо была адной з самых прадстаўнічых у Белдзяржкансерваторыі. Аднак тут не існавала спецыяльнага вучэбна-метадычнага згуртвання, якое паслядоўна і мэтанакіравана працавала б менавіта ў беларусазнаўчай галіне і рыхтавала спецыялістаў з адпаведнай кваліфікацыяй. Трэба было валодаць



Репозиторий учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"

сапраўды крэатыўным, дзяржаўным мысленнем, каб прадбачыць выніковасць такога падыходу — стратэгічнага, у якім стрыжнявым тактычным кірункам быў усё той жа, ключавы для дзейнасці самога Міхаіла Антонавіча, — шматвектарны ды поліфункцыянальны падыход. У дачыненні да створанай ім новай кафедры гэта значыла яднанне фундаментальнай навукі, педагагічнай ды мастацкай практыкі. Вынікі рэалізацыі гэтай ідэі зараз добра вядомыя — па грунтоўных, прызнаных ва ўсім свеце этнамузыкалагічных распрацоўках; па навуковых адкрыццях, што цалкам перавярнулі колішнія ўяўленні аб гісторыі айчыннага музычнага мастацтва; па тысячах публікацый у айчынным і замежным друку; па самых прэстыжных міжнародных форумах, дзе заўжды жаданымі гасцямі з'яўляюцца беларускія музыказнаўцы; па заснаваных на трывалым навукова-крыніцазнаўчым падмурку грандыёзных творчых праектах, якія прэзентуюць музыку даўняй і сучаснай Беларусі ў сотнях канцэртаў, фестываляў і асветніцкіх імпрэз; па якасным росце і пашырэнні музычнага беларусазнаўства не толькі ў нашай, але ва ўсіх адукацыйных установах краіны; нарэшце, па вынаходніцкім руху маладых музыказнаўцаў-беларусістаў, чые даследаванні адкрылі новыя далягляды ў музычным свеце. Эўрыстычная энергетыка ўсіх гэтых падзей была закладзена яшчэ тады, 20 гадоў таму, калі сама іх ідэя падавалася вялікай утопіяй, а будаванне новай, адзінай у свеце, кафедры патрабавала тытанічных намаганняў рэктара і тых яго аднадумцаў, якія адгукнуліся на выказаную ім прапанову. Ён жа цалкам даверыўся ім, выдатным спецыялістам, вучоным з еўрапейскімі імёнамі — Т. Якіменка, В. Антаневіч, Л. Касцюкавец, І. Назінай, Т. Ліхач, а потым і мне... Атрымаўшы запрашэнне працаваць на кафедры, я не сумнявалася ні хвіліны, бо асэнсоўвала пачэснасць і адказнасць гэтай прапановы. Час жа паказаў: ідэя Міхаіла Антонавіча была не толькі бездакорнай, але і лёсазначнай для беларускага мастацтва, а яе рэалізацыя заўсёды заставалася клопатам рэктара. Ён горача падтрымліваў усе праекты кафедры — ад навуковых канферэнцый да фальклорных экспедыцый. Ён аказваў дапамогу кожнаму супрацоўніку, які імкнуўся сказаць новае слова ў навуцы. Бывала нават так, што ў выніку розных абставін ён браўся па ўласнай ініцыятыве падтрымліваць нас на самым вышэйшым узроўні, за што я асабліва ўдзячная рэктару. Але галоўнае — ён стварыў асобую атмасферу ў нашай установе, дзе беларускае слова, беларуская думка, беларуская навука аб музыцы і, перадусім, сама беларуская музыка была і застаецца ў цэнтры адукацыйнай сістэмы. Менавіта дзякуючы яго ўпартай і мэтанакіраванай працы па ўмацаванні беларускай ідэі ў музычным свеце гэтая ідэя, не дэкларованая, а высокамастацка ўвасобленая аўтарытэтным музыкантам і кіраўніком, пашырылася і на іншыя сферы культуры. Можна нават без перабольшання сцвярджаць: у тым, што, пры ўсіх непазбежных наступствах глабалізацыі, беларускі кампанент застаецца вядучым у сучаснай культурнай палітыцы краіны, шмат у чым заслуга менавіта Міхаіла Антонавіча, для якога такі, сапраўды дзяржаўны падыход з'яўляецца арганічным увасабленнем уласнай мастацкай і грамадзянскай пазіцыі. Сёння, дарэчы, мы неяк саромеемся ўжываць гэтае слова — Патрыятызм, якое, мабыць, занадта часта вымаўлялася ў мінулым. Аднак менавіта яно найбольш дакладна перадае сэнс усіх кірункаў дзейнасці Міхаіла Казінца — музыканта, рэктара, грамадзяніна. Нездарма, дарэчы, яго слова было і застаецца вырашальным у тых арганізацыях і ўстановах, якія ажыццяўляюць апеку над мастацкімі праектамі, і перш за ўсё ў Камісіі па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

Безумоўна, кіраўніцтва буйной установай, шматгранная грамадская дзейнасць запатрабавалі шматлікіх ахвяр, у тым ліку і творчых: толькі сам маэстра ведае, колькі яго мастацкіх планаў засталося нязздзейсненымі, колькі канцэртных праграм засталіся толькі ў думках ды марах... І ўсё ж яго творчы альтруізм, яго адданасць краіне, беларускаму народу, нацыянальнай ідэі былі і застаюцца той крыніцай, тым каранёвым утварэннем, што мацуе разгалінаванае і пладаноснае дрэва яго стваральнай дзейнасці. Таго неўтаймаванага і выніковага руху, які здзяйсняе Міхаіл Казінец — Асоба, Стваральнік, Музыкант, Грамадзянін.



*М. А. Казінец за пультам сімфанічнага аркестра БДАМ «Маладая Беларусь»*

Репозиторий Учреждения образования "Белорусская государственная академия музыки"